ДУК " Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр
і сетка публічных бібліятэк"

2023

Люты

# Бібліятэчны веснік














**Інфармацыйны веснік**

# Люты

2

У рамках праекта “БиблиоИстории” у лютым ва ўсіх аддзелах **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** праходзіў цыкл юбілейных выстаў “Юбилейный экспресс”, на якіх карыстальнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з кнігамі і пісьменнікамі-юбілярамі 2023 года.




У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі быў афармлены **літаратурны подыум “Дыяменты прыгожага пісьменства”**. Карыстальнікі знаёміліся з цудоўнымі зборнікамі вершаў і прозай любімых беларусамі аўтараў.

У музейным пакоі “Библиотека в истории” была прадстаўлена **экспазіцыя “Ганаравы юбілей”,** пазнаёміўшыся з якой наведвальнікі мелі магчымасць даведацца пра кнігі беларускіх пісьменнікаў, якім сёлета споўнілася 100 і больш гадоў. На працягу месяца для наведвальнікаў праходзілі агляды выставы, дзе бібліятэкары расказвалі пра гісторыю стварэння твораў, значэнне іх у беларускай літаратуры, біяграфію аўтараў. Акрамя новых выданняў кніг, прадстаўлены слайды з выявай першых выданняў.

У аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры маленькія чытачы з задавальненнем знаёміліся з выставай…



На ўваходзе якой старажытнай бібліятэкі было напісана "Аптека для души"? Якую бібліятэку Марк Антоній падарыў царыцы Клеапатры? Якая бібліятэка ў Беларусі лічыцца самай першай? Дзе шукаць бібліятэку Яраслава Мудрага? Пра ўсё гэта і многае іншае была магчымасць даведацца наведаўшы ў лютым **выставу "Тайны древних библиотек"** у музейным пакоі "Библиотека в истории", якую афармілі бібліятэкары **Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі** ў рамках праекта "БиблиоИстории".




**2 лютага** да Сусветнага дня водна-балотных абшараў ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** для дзяцей школьнага ўзроста была праведзена **пазнавальна-экалагічная гадзіна "Прастора таемная і загадкавая".** Дзеці даведаліся, што у Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з Рамсарскай канвенцыяй ахоўваецца 9 водна-балотных угоддзяў, якія маюць міжнароднае значэнне. Прысутныя зачыталі вершы Міхася Пазнякова "Нашы балоты", "Нашы рэкі", Яніны Жабко "Куточак зямлі", Пятруся Броўкі "Дарагая Беларусь". Затым усе разам адгадвалі загадкі і пазнаёміліся з энцыклапедычнай літаратурай адпаведнаю тэматыкі мерапрыемства.

**3 лютага ў Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** для навучэнцаў малодшых класаў ДУА "Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Антіпава" (удзельнікі экалагічнага клуба "Лесавічок") было арганізавана **экалагічнае асарці "Будь другом цветку, дереву, человеку!",** прымеркаванае да 150-годдзя з дня нараджэння М. Прышвіна. Дзеці пазнаёміліся з біяграфіяй і творчасцю пісьменніка, а потым падзяліўшыся на дзве каманды, спаборнічалі ў конкурсах: зачыталі некалькі апавяданняў пісьменніка і адказалі на пытанні віктарыны, складалі назвы апавяданняў, збіралі пазлы на хуткасць. Таксама прынялі актыўны ўдзел у танцавальным батле, а ў завяршэнні мерапрыемства дзецям быў прадстаўлены відэа-ролік "Веселые котики".



**4 лютага** ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы прайшла **інфармацыйная гадзіна “Дудар беларускі”,** прымеркаваная да 215-годдзя з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча. Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з жыццём і творчасццю пісьменніка, з яго творамі.





**4 лютага** да 150-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Міхайлавіча Прышвіна ў Даўгапольскай сельскай бібліятэцы бібліятэкар аформіла **кніжную выставу “Зазірні ў кладоўку сонца”.** На выставе прадстаўлены кнігі “Камора сонца”, “У краі дзядулі Мазая”, “Лісічкін хлеб”, “Этажы лесу”, а таксама бібліяграфічныя звесткі аб аўтары.




Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка

**4 лютага** бібліятэкар **Межанскай бібліятэкі-клуба** сабрала ўдзельнікаў клуба сямейнага чытання “Дружная семейка” на **літаратурны навігатар “Волшебник русского леса – Михаил Пришвин”.** Знаёмства з творчасцю класіка праходзіла ў гульнявой форме. Дзеці і бацькі разгадвалі загадкі і шарады ў якіх былі зашыфраваны назвы апавяданняў Міхаіла Прышвіна. Зачытвалі ўрыўкі з апавядання “Ёж”. Сямейныя каманды адказвалі на пастаўленыя пытанні, тым самым правяраючы сваю ўважлівасць.

**4 лютага** ўжо традыцыйна ў **Руднянскай бібліятэцы-клубе** адбыўся **вечар адпачынку “Юность школьная моя”,** на які сабраліся выпускнікі розных гадоў. Былыя вучні і настаўнікі дзяліліся ўспамінамі аб школьным жыцці. На мерапрыемстве гучалі вершы і песні, прайшлі жартоўныя конкурсы.

З 7 па 28 лютага ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** была аформлена кніжная выстава **“Жизнь. Память. Судьба”**, прысвечаная 105-годдзю з дня нараджэння Героя СССР, Героя Сацыялістычнай Працы, выбітнага дзяржаўнага дзеяча Беларусі Пятра Міронавіча Машэрава. З імем Машэрава звязана прысваенне Мінску звання горада-героя, стварэнне сусветна вядомых мемарыяльных комплексаў “Хатынь”, “Брэсцкая крэпасць”, “Курган Славы”. На выставе экспануюцца кніжныя выданні, матэрыялы, якія асвятляюць жыццё і шматгранную дзейнасць Пятра Мірановіча. Таксама ў сельскіх бібліятэках сеткі дэманстраваліся выставы, прысвечаныя гэтаму значнаму ў гісторыі Беларусі чалавеку: **выстава-інфармацыя “Личность в истории” (Пальмінская сельская бібліятэка), выстава-ўспамін “Слава и гордость народа” (Віраўлянская сельская бібліятэка), выстава-юбілей “Мы этим именем гордимся”(Бычыхінская сельская бібліятэка), “Страницы большой жизни: П. М. Машеров” (Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка).**



**Бычыхінская сельская бібліятэка**




**Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка**




**Пальмінская сельская бібліятэка**




**Віраўлянская сельская бібліятэка**

**8 лютага** да дня юнага героя-антыфашыста ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** для падлеткаў прайшла **патрыятычная гадзіна “Вайна і дзеці”.** Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з кнігамі аб лёсе дзяцей, на долю якіх выпалі вельмі цяжкія выпрабаванні ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



**8 лютага** бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** для навучэнцаў 8-9 класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І. М. Антонава” правялі **дыялог у кніжнай выставы “Мир приключений”.** Мерапрыемства прысвечана 195-годдзю з дня нараджэння пісьменніка Ж. Верна. Бібліятэкары правялі агляд выставы, задавалі пытанні прысутным па творам пісьменніка, якія яны прачыталі раней.



У Межанскай сельскай бібліятэцы да 195-годдзя з дня нараджэння Жуля Верна была аформлена **выстава-арыенцір “Под парусами приключений”.**

**Дубраўская сельская бібліятэка** працягвае працаваць у рамках праекта “Мир пернатых и зверей, ждёт поддержки от друзей”. **10 лютага** для дзяцей пачатковых класаў прайшоў **пазнавальны ўрок “Как зимуют звери в лесу”.** Мэта мерапрыемства – абагульніць веды дзяцей аб звычках звяроў зімой, спосабах абароны ад ворагаў, здабывання ежы. Бібліятэкар прапанавала ўдзельнікам кнігі з якіх ёсць магчымасць найбольш падрабязна даведацца аб дадзенай тэме. Як заўжды мерапрыемства прайшло вельмі весела і цікава.



**10 лютага** для чытачоў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** былі арганізаваны і прадстаўлены **кніжныя жмуркі “Свидание с книгой вслепую”**. Кожны жадаючы мог выбраць кнігу па “імглістым” намёку, а даведацца, што гэта за кніга чытач мог толькі дома.

**10 лютага** ў чытальнай зале аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для маленькіх аматараў казак прайшла **гульня-віктарына “Мы героі казак, адгадайце без падказак!”.** На мерапрыемства запрасілі вучняў 1-га класа ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Гарадка імя І. Х. Баграмяна”. Разам з бібліятэкарам дзеці пагрузіліся ў чароўны свет казкі: успаміналі казачных герояў, з задавальненнем адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні, разглядалі кнігі і часопісы. Мерапрыемства прайшло весела і захапляльна. Дзеці лёгка справіліся з усімі заданнямі віктарыны. У канцы сустрэчы прысутныя паглядзелі прэм'еру лялечнага спектакля “Бесклапотны зайка”. Казачнае падарожжа атрымалася цікавае і пазнавальнае.





**12 лютага** бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** запрасілі моладзь вёскі на **бяседу-знаёмства “Душа поёт”,** прымеркаваную да 105-годдзя са дня нараджэння Ф. Шаляпіна. Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з біяграфіяй вялікага рускага опернага спевака і артыста, яго песнямі і ролямі.



**14 лютага** ў **Верамееўскай сельскай бібліятэцы** для ўдзельнікаў клуба “Надежда” прайшла **літаратурна-паэтычная гадзіна “О любви с любовью”.** На мерапрыемстве гучалі лірычныя вершы, успаміналі літаратурныя творы аб каханні знакамітых класікаў.

**15 лютага** – дзень вываду савецкіх войскаў з Афганістана, Дзень памяці воінаў інтэрнацыяналістаў. Гэта неабвешчаная вайна, якая доўжылася 9 гадоў, 1 месяц і 19 дзён. Бітвы канчаюцца, а гісторыя  вечная. Пайшла ў гісторыю і афганская вайна. Але ў памяці людской ёй жыць яшчэ доўга, таму што яе гісторыя напісана крывёю салдат і слязамі маці.




34-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана была прысвечана **літаратурная кампазіцыя “Афганистан живет в душе моей”,** з якой была магчымасць азнаёміцца ў **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы.** На ёй прадстаўлены кнігі і публікацыі аб Афганскай вайне. Адмысловае месца вылучана матэрыялам аб нашых земляках, якія выконвалі баявы абавязак у Афганістане.



**15 лютага** ў Дзень памяці воінаў інтэрнацыяналістаў у **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** была аформлена **выстава-інфармацыя “Память Афгана – боль Афгана”,** а ў **Межанскай сельскай бібліятэцы – выстава-экскурс “Возвращаясь памятью к войне”**, на якіх прадстаўлена літаратура з фонду бібліятэкі, выразкі з газет.




**15 лютага** ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для навучэнцаў старэйшых класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” адбылася **размова-рэквіем “Выполняя долг интернациональный”.** На мерапрыемстве прысутнічаў жыхар вёскі Бычыха ўдзельнік вайны ў Афганістане – Судараў А.М. Алег Мікалаевіч падзяліўся ўспамінамі аб падзеях смутнага часу, сведкам якіх ён быў, распавёў аб таварышах, якія коштам свайго жыцця выконвалі воінскі абавязак. Бібліятэкар зрабіла невялікі экскурс у гісторыю ўводу савецкіх войскаў у Афганістан, далей успомнілі землякоў, якія гераічна выконвалі свой воінскі абавязак. Прайшоў агляд **кніжнай выставы “Афганістан жыве ў маёй душы”.**



**15 лютага** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** на **праваслаўную сустрэчу "Праздник православного календаря: Сретение Господне"** сабраліся ўдзельнікі клуба аматараў духоўнай гісторыі гарадоччыны "Светач". Іерэй Уладзімір Дагодзька расказаў аб вытоках узнікнення свята, адказаў на пытанні прысутных. "Клубнікі", якія сабраліся на пасяджэнне, даведаліся з расповеду бібліятэкара пра тое, што гэта свята з'яўляецца адным з найважнейшых дзён у праваслаўным календары, якое сімвалізуе сустрэчу Старога і Новага Запавету, а ў народзе гэты дзень лічаць мяжой паміж зімой і вясной. Настаяцель Храма святых прападобнапакутніц вялікай княгіні Елісаветы і інакіні Варвары айцец Стахій расказаў цікавую гісторыю пра тое, як часам адбываецца сустрэча чалавека з Богам. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэафільма "Сретение Господне".

**16 лютага** ў рамках раённай акцыі "Наш животновод" бібліятэкар **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** правяла **тэматычны агляд журналаў "Всё полезное – здесь!"** для работнікаў сельскай гаспадаркі на ферме у вёске Стайкі.



**18 лютага** да 130-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага ў Віраўлянскай сельскай бібліятэцы карыстальнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з **юбілейнай выставай "Сцежкамі жыцця Максіма Гарэцкага".**

**Бычыхінская сельская бібліятэка** працягвае рэалізоўваць праект "Адкрый для сябе беларускую кнігу". **19 лютага** бібліятэкары для дзяцей правялі **літаратурную віктарыну "У гасцях у казцы беларускай".** Прысутныя пазнаёміліся з беларускімі народнымі казкамі, адгадвалі іх герояў.

**16 і 17 лютага** маленькія выхаванцы з дзіцячых садкоў горада разам з бібліятэкарам аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адправіліся ў **віртуальнае падарожжа “Чароўнае кола беларускіх казак”** па цудоўным свеце беларускай сучаснай казкі. Падчас сустрэчы маленькія падарожнікі пазнаёміліся з такімі беларускімі пісьменнікамі, як Н. Галіноўская, Г. Аўласенка, Р. Бензярук і інш. З вялікім задавальненнем дзеці паслухалі казкі гэтых аўтараў, паразгадвалі загадкі па творах М. Чарняўскага і В. Віткі, паўдзельнічалі ў вясёлых гульнях і конкурсах “Пераўтварыся ў казачнага героя”, “Гусі ляцяць”, “Заінька”, “Сляпы музыка”, “Міхаськаў лапаць”. Завяршылася мерапрыемства паказам лялечных спектакляў “Як кот звяроў напалохаў” і “Бесклапотны зайка”.



**16 лютага** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшоў адзіны дзень інфармавання з удзелам начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гарадоцкага райвыканкама Мазжаравай Святланы Віктараўны і намесніка начальніка Гарадоцкага РАУС – начальніка крымінальнай міліцыі Вілюга Аляксандра Сяргеевіча.

Галоўныя тэмы сустрэчы: “Обеспечение военной безопасности – важнейший фактор развития Республики Беларусь в современных условиях” (да 105-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь), “85 лет со дня образования Витебской области”, “Основные правила безопасного поведения на льду”, “Предупреждение мошенничеств и грабежей, в том числе совершаемых несовершеннолетними”.Таксама падчас размовы члены інфармацыйна-прапагандысцкай групы абмеркавалі з прысутнымі пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, патрыятычнага выхавання моладзі, святкавання Дня пісьменства.



**19 лютага** ў **Прудніцкай сельскай бібліятэцы** для маленькіх чытачоў і іх бацькоў прайшоў **агляд-рэкамендацыя “Первая книга малыша”.** Бібліятэкар распавяла маленькім карыстальнікам аб кнігах з фонду бібліятэцы адпаведных іх ўзросту, дала рэкамендацыі бацькам як прывіць маленькім дзецям любоў да чытання.

**21 лютага** ва ўсім свеце адзначаецца Дзень роднай мовы, мэтай якога з'яўляецца абарона моўнай і культурнай разнастайнасці. Да гэтай значнай даты ў бібліятэках Гарадоцкай сетцы прашлі разнастайныя мерапрыемствы.

**17 лютага** бібліятэкары **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** сумесна з супрацоўнікамі ДУК "Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна" філіял "Езярышчанскі гарпасялковы дом культуры" арганізавалі і **правялі літаратурна-пазнавальную гульню "Сябруй з роднай мовай",** якая была прымеркавана да Міжнароднага дня роднай мовы. На працягу мерапрыемства дзеці даведаліся аб гісторыі свята, адгадвалі загадкі на беларускай мове. Дзецям быў прадстаўлены музейны пакой у бібліятэцы "Спадчына продкаў", дзе аформлена экспазіцыя старажытнай хаты. Бібліятэкар расказала пра жыццё нашых далёкіх продкаў, вялікую ўвагу надаўшы чатыром кутам у сялянскай хаце, якія мелі сваё прызначэнне ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці чалавека, а таксама прадметам побыту. Была праведзена экскурсія па бібліятэцы, а ў заключэнні мерапрыемства прысутныя пaглядзелі краязнаўчы відэаролік "Сэрцу мілая старонка", які знялі супрацоўнікі бібліятэкі аб родным пасёлке.






**19 лютага** бібліятэкар **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі** сумесна з супрацоўнікамі ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” філіял Даўгапольскі сельскі клуб, правялі **тэматычную гадзіну “Мова - скарб народа”.** Удзельнікі мерапрыемства даведаліся аб гісторыі свята, аб разнастайнасці моў у свеце, аб прычыне знікнення іх, аб неабходнасці захавання знікаючых. Цікава прайшоў агляд **кніжнай выставы “Роднай мовы – гук чароўны”.**




Да Міжнароднага дня роднай мовы ў **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** на працягу тыдня для карыстальнікаў прайшла **акцыя “Чытаем кнігі на роднай мове”**. Усе жадаючыя мелі магчымасць прыняць удзел у **моўнай хвілінцы “Дакраніся да роднага слова”,** пад час якой, усім наведвальнікам прапанавалася размаўляць на беларускай мове і сыграць у займальную гульню на веданне беларускіх прыказак. Таксама бібліятэкары прапанавалі чытачам памяткі-закладкі з крыжаванкамі – перакласці з беларускай мовы на рускую словы або наадварот. На абанементе была прадстаўлена **кніжная выстава “Дыяменты прыгожага пісьменства”,** у фае **выстава-інсталяцыя “Крыніцы роднага слова”.** На кніжных выставах размяшчана літаратура беларускіх аўтараў на беларускай мове.






З нагоды Міжнароднага дня роднай мовы ў **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы з 21 па 26 лютага** праходзіў **Тыдзень роднай мовы “Каб родная мова гучала”.** За гэты час было праведзена шмат розных цікавых мерапрыемставаў, якія наведалі маленькія выхаванцы з дзіцячых садкоў горада, вучні малодшых класаў і наведвальнікі бібліятэкі.

Адкрыўся Тыдзень роднай мовы “Каб родная мова гучала” **мовазнаўчай гульнёй “Пра мову беларускую – цікава і займальна”,** дзе маленькія карыстальнікі пазнаёміліся з беларускімі прыказкамі, беларускімі пісьменнікамі, а таксама паўдзельнічалі ў конкурсе загадак. Дзеці прымалі ўдзел у **акцыі “Размаўляй са мной па-беларуску”,** інтэрактыўных гульнях “Кола загадак” і “Перакладач”, у гульне слоў “Вясёлы ералаш”. Дзеці з захапленнем выконвалі ўсе прапанаваныя заданні, атрымлівалі за правільны адказ салодкі пачастунак – цукеркі. А тыя, хто пажадаў прыняць удзел у **акцыі “Мова родная – мова модная”**, атрымалі ў падарунак прыгожыя закладкі для кніг. Увесь тыдзень дзейнічалі **выставы кніг беларускіх аўтараў “Чароўнае кола беларускіх казак” і “Міжнародны дзень роднай мовы”.** Гэты Тыдзень, безумоўна, нікога не пакінуў абыякавым. А супрацоўнікі аддзела зрабілі ўсё магчымае, каб праграма мерапрыемстваў была яркая і цікавая.








**21 лютага** да Міжнароднага дня роднай мовы ў сельскіх бібліятэках сеткі, таксама прайшлі тэматычныя мерапрыемствы. У Дубраўскай сельскай бібліятэцы наведвальнікам прапаноўвалася прыняць удзел у **акцыі “Гаварым па беларускі”** – прачытаць тэкст і перавесці яго на беларускую мову.





**21 лютага** бібліятэкары **Пальмінскай сельскай бібліятэкі** правялі **літаратурную гадзіну “Родная мова - крыніца празрыстая”.** Мерапрыемства пачалася з размовы аб роднай мове. Дзеці ахвотна разгадвалі беларускія загадкі, успаміналі самыя прыгожыя і кранальныя беларускія словы і кнігі беларускіх аўтараў, якія асабліва спадабаліся. **Кніжная выстава “Любі, шануй, ведай роднае слова”** зацікавіла не толькі ўдзельнікаў мерапрыемства, але і ўсіх чытачоў, якія ў гэты дзень наведалі бібліятэку.

Да Міжнароднага дня роднай мовы бібліятэкар **Межанскай бібліятэцы-клуба** запрасіла маленькіх жыхароў вёскі на **гульнявую праграму “Гарэза”**. Мерапрыемства было прысвечана не толькі значэнню роднай мовы ў жыцці кожнага чалавека, але і таму, што важна шанаваць традыцыі і звычаі свайго народа. З вялікай увагай дзеці слухалі расказ бібліятэкара пра старадаўнія народныя гульні, а потым са здавальненнем гулялі ў іх.






**21 лютага** да Міжнароднага дня роднай мовы бібліятэкар **Віраўлянскай сельскай бібліятэкі** сумесна з супрацоўнікамі ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” філіял Віраўлянскі сельскі клуб запрасілі дзяцей на **гульню-падарожжа “Па краіне роднай мовы”.** Пачалося мерапрыемства вершам І. Пракаповіча “Пагавары са мной на мове”. Прысутныя не проста пагаварылі на роднай мове, а адправіліся ў падарожжа з прыпынкамі: “Загадкі”, “Перакладчыкі”, шарада “Пралеска”, “Словаведы”, “Старонкі мінулага і сучаснага”, “Пра каго так гавораць”, “Знаўцы беларускага фальклору”, “Скарагаворкі”. У выкананні дзяцей прагучалі вершы пра родную мову. Дапоўніла мерапрыемства **кніжная выстава “Жыве родная мова”.**







**21 лютага** Да Міжнароднага дня роднай мовы ў **Верхоўскай сельскай бібліятэцы** для карыстальнікаў была прапанавана **акцыя-прапанова “Родная мова – сродак зносін”.** Гаворка ішла пра гісторыю ўзнікнення Дня роднай мовы, пра неабходнасць яе захавання. Прагучалі словы, прысвечаныя сваёй мове беларускіх пісьменнікаў у вершах і прозе. Кожны зразумеў, што трэба любіць і шанаваць родную мову, бо менавіта ў мове захавана гісторыя нашага народа, сіла і краса народнага слова.

**21 лютага Дубраўскую сельскую бібліятэку** наведалі ўдзельнікі клуба “Познавайка”, каб паўдзельнічаць **ў конкурсе малюнкаў “Зимушка-зима”.** Бібліятэкар распавяла дзецям аб мастаках і пісьменніках якія ў сваіх творах адлюстравалі ўсю прыгажосць зімовай прыроды. Затым дзеці самі намалявалі прыгожыя малюнкі.

**22 лютага** для ўдзельнікаў клуба “Добрые встречи” **у Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** прайшла **чайная паляна “Чай пить – здоровым быть и долго жить”.** Кіраўнік клуба пазнаёміла прысутных з гісторыяй з'яўлення гарбаты, аб карысці чаявання. Затым усе разам удзельнічалі ў чайных конкурсах, гулялі ў гульні, спявалі прыпеўкі і пілі духмяную гарбату з пірагом.



**22 лютага ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для дзяцей прайшла **пазнавальная гульня “С песней, шуткой и в игре – изучаем ПДД”.** Бібліятэкар разам з маленькімі ўдзельнікамі пагаварылі пра тое, што ўсе мы з'яўляемся ўдзельнікамі дарожнага руху, бо кожнаму з прысутных даводзіцца пераходзіць вуліцу ці дарогу, карыстацца грамадскім транспартам, таму кожны павінен ведаць і прытрымлівацца правілаў. Дзеці з вялікай увагай слухалі бібліятэкара, актыўна адказвалі на пытанні займальнай віктарыны “Внимательный пешеход”, паказаўшы свае веды і ўважлівасць. З задавальненнем удзельнічалі ў конкурсах і гульнях “Собери знак”, “Дорога, транспорт, пешеход”, “Разрешается – запрещается”, “Узнай знак”, адгадвалі загадкі. У канцы ўсе прысутныя паабяцалі выконваць правілы для пешаходаў і веласіпедыстаў і быць уважлівымі на дарогах.



**22 лютага** бібліятэкар чытальнай залы **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** запрасіла навучэнцаў 1-х і 2-х класаў ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Гарадка імя І. Х. Баграмяна” на **ўрок-падарожжа “Безопасность дома”.** Дзеці ў гульнявой форме, на прыкладах казачных герояў, вывучылі правілы паводзін дома і на вуліцы. Прайшоўшы станцыі “Один дома”, “Незнакомец”, “Электроприборы”, “Лекарства и бытовая химия” “Балкон, окно”, навучэнцы даведаліся, што нельга пакідаць без нагляду электранагравальныя прыборы (а таксама іншыя правілы бяспекі пры выкарыстанні электраабсталявання), разабраліся ў прычынах узнікнення пажараў і іх наступствах, успаміналі, як дзейнічаць, калі ўзнік пажар, а ў пакоі шмат дыму і цяжка дыхаць, называлі нумары тэлефонаў, па якіх можна патэлефанаваць у выпадку ўзнікнення небяспечнай сітуацыі, расказалі, якую інфармацыю неабходна паведаміць дзяжурнаму і як паводзіць сябе з незнаёмымі людзьмі на вуліцы. Падводзячы вынік сустрэчы, дзеці прыйшлі да высновы, што многія няшчасныя выпадкі можна прадухіліць, выконваючы самыя элементарныя правілы бяспекі.



У лютым бібліятэкары **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** запрасілі карыстальнікаў сцыяльных сетак прыняць удзел у патрыятычным **Інтэрнэт-чэленджы “Аб тых, хто ў арміі служыў”,** які праводзіўся ў рамках святкавання 105-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Для ўдзелу ў чэленджы неабходна было на старонцы ў сацыяльных сетках “ВКонтакте”, “Одноклассники”, “Инстаграм” размясціць фатаграфіі сябе ці сваіх родных, якія служылі ў арміі і ўсіх тых хто ў цяперашні час служыць.

**23 лютага ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** прайшла **конкурсная праграма “Аты-баты!”,** прысвечаная Дню абаронцаў Айчыны. У спаборніцтве прынялі ўдзел вучні малодшых класаў ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Гарадка імя І. Х. Баграмяна”. На пачатку мерапрыемства бібліятэкар павіншавала будучых абаронцаў Айчыны са святам, а потым прапанавала ім на некаторы час апынуцца на службе ў арміі, праверыць свае сілы, спрыт і кемлівасць. Яны ўдзельнічалі ў цікавых і вясёлых конкурсах і гульнях: “Самый умный”, “Один на один”, “Роем окопы”, “Собери волю в кулак”, “Упал – отжался”, “Быстрота”. У канцы падвяліся вынікі і пераможцам былі ўручаны медалі. Мерапрыемства прайшло вельмі цікава, пазнавальна і весела.






**22 лютага** бібліятэкары **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** для навучэнцаў 7 класа ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Антіпава” была арганізавана **конкурсна-гульнявая праграма “Честь имеем!”,** прымеркаваная да Дню абаронцаў Айчыны. Прысутныя падзяліліся на дзве каманды і спаборнічалі паміж сабой. Дзеці актыўна адказвалі на пытанні, звязаныя з войскам, ваенным транспартам, воінскімі званнямі, выконвалі патрыятычныя заданні, удзельнічалі ў жартоўных конкурсах. У заключэнні мерапрыемства пераможцы атрымалі памятныя падарункі.



**23 лютага ў Межанскай бібліятэцы-клубе** да Дня абаронцы Айчыны для маленькіх чытачоў прайшоў **вясёлы перапынак “Армейский экспресс”.** Дзеці адчулі “цяжкасці армейскага побыту”, прыняўшы ўдзел у вясёлых конкурсах, праявілі кемлівасць і веды ў галіне ваеннай гісторыі адказаўшы на пытання віктарыны.





**23 лютага** бібліятэкары **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** правялі для навучэнцаў 4 класа ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Антіпава” **патрыятычна-гульнявую праграму “Сильные, ловкие, быстрые”** На працягу мерапрыемства вучням былі прапанаваны розныя заданні, віктарыны, конкурсы: “Разведчики”, “Будущий десантник”, “Эрудиция”, “Собери волю в кулак”, “Связисты”, “Человек военный”, “Строевая подготовка”, “Кто быстрее” і інш.





**23 лютага ў Верамееўскай сельскай бібліятэцы** сабраліся ўдзельнікі клуба “Почемучки” на **патрыятычную гадзіну “Защита страны в надежных руках”,** прысвечаную Дню абаронцаў Айчыны. Гаворка ішла аб тым хто аддаў жыццё за Радзіму і хто сваёй бяспрыкладнай мужнасцю і гераізмам абараніў права беларускага народа на свабоду і магчымасць быць гаспадаром на сваёй зямлі.

Масленіца – старадаўняе славянскае свята праводзінаў зімы. Святкаванне Масленіцы суправаджалася абрадамі, celebrating рознымі забавамі і гульнямі.

**25 лютага** работнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прынялі ўдзел у гарадскім свяце народнага календара “Широкая Масленица”, якое адбылося ва ўрочышчы Вараб'ёвы горы. Для гасцей свята была прадстаўлена **тэматычная пляцоўка “Душа моя, Масленица!”**. Тут усе ахвочыя маглі пачаставацца смачнымі блінамі, духмянай гарбатай і зрабіць яркія фатаграфіі ў тэматычнай фотазоне. Да мерапрыемства была падрыхтавана выстава “Чай и варенье для здоровья и настроенья”, азнаёміўшыся з якой можна было даведацца пра розныя спосабы прыгатавання варэння і гарбаты, а таксама традыцыі святкавання Масленіцы.






**24 лютага ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для вучняў малодшых класаў ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Гарадка імя І. Х. Баграмяна” (у рамках святкавання Масленіцы) прайшла **гадзіна фальклору “Красное солнышко – гори, гори ясно!”.** У гэты дзень удзельнікі мерапрыемства змаглі развітацца з халодным часам года і павітаць надыходзячую вясну. Бібліятэкар пазнаёміла з традыцыямі і абрадамі старажытнага і вясёлага звычаю, расказала аб назве і значэнні кожнага дня масленічнага тыдня, узгадала прыказкі і прымаўкі пра свята. А якая ж Масленіца без вясёлых гульняў і забаў? Дзеці з вялікім задавальненнем прынялі ўдзел у вясёлых конкурсах і народных гульнях: “Бой на воздушных шариках”, “Кулачные бои”, “Попади в мишень”, “Сковорода”, “Бег на трёх ногах”, “Мотальщики”, “Лучший исполнитель частушек”. Напрыканцы свята ўсе прысутныя частаваліся духмянымі блінамі.





**26 лютага** бібліятэкар **Межанскай бібліятэкі-клуба** сумесна з супрацоўнікам Межанскага сацыяльнага пункта ДУА “Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гарадоцкага раёна” запрасілі пенсіянераў і людзей з абмежаванымі асаблівасцямі здароўя на **святочнае мерапрыемства “Масленица краса – блины до поста”.** Прысутныя ўспомнілі гісторыю святкавання Масленіцы, народныя традыцыі, гульні і забавы. Даведаліся, што прынята рабіць кожны дзень масленічнага тыдня, з вялікім жаданнем удзельнічалі ў розных конкурсах, расказвалі прыказкі пра бліны, чыталі вершы.



**26 лютага** ўдзельнікі клуба “Мои года, моё богатство”, у склад якога ўходзяць людзі пенсіённага ўзросту, сабраліся ў **Руднянскай бібліятэцы-клубе** каб адзначыць **фальклорнае свята “Масленица у ворот – заходи в наш хоровод”.** Госці мерапрыемства ўдзельнічалі ў розных гульнях і конкурсах. Спявалі масленічныя песні і частаваліся блінамі.



Таксама свята Масленіца разам з сельскімі клубамі арганізавалі і правялі **Кабішчанская і Сцяпанавіцкая сельскія бібліятэкі.**



Фальклорнае свята
“Вітаем шчодрую Масленіцу”
Кабішчанская сельская
бібліятэка



Свята народнага календара
“Приходи честной народ,
Масленица у ворот”
Сцяпанавіцкая сельская бібліятэка

**25 лютага ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для маленькіх чытачоў адбылася **займальна-пазнавальная гадзіна “Их стихия -небо”.** Падчас мерапрыемства дзеці пазнаёміліся з дзіўным светам птушак, даведаліся пра іх звычкі і пражыванне ў розныя поры года, якія птушкі з'яўляюцца пералётнымі, а якія зімуюць. Прысутныя разгадвалі загадкі пра птушак, удзельнічалі ў вясёлых гульнях “Обед для птиц”, “Кто в теремочке живёт”, “Лучший знаток сказок”, “Подбери пару”, актыўна адказвалі на пытанні арніталагічнай віктарыны “Думай, смекай, вспоминай”. Напрыканцы мерапрыемства дзеці разам з бібліятэкарам усе разам зрабілі выснову, што без птушак здарыцца бяда, таму птушак трэба берагчы і дапамагаць ім.



У рамках праекта “Писатели и поэты родного края” бібліятэкары адзела абслугоўвання і інфармацыі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прадставілі для карыстальнікаў сайта Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк **слайд-прэзентацыю “Живые рифмы зимы”.** Усім жадаючым прапанавалася акунуцца ў зімовую казку прыроды, атрымаць асалоду ад дзівосных відаў зімовых карцін і прачытаць вершы пра зіму паэтаў-землякоў.

**25 лютага ў Віраўлянскай сельскай бібліятэцы** прайшло паседжанне клуба “Зеленая беседка” – **гадзіна карысных парад “Крошки на окошке: Все о рассаде”.** Мерапрыемства прайшло ў форме круглага стала. Удзельнікі клуба падзяліліся вопытам вырошчвання расады, расказалі аб спадабаўшыхся сартах. Бібліятэкар правяла **агляд часопіса “Сваты на даче”.**



**25 лютага** адпачываючых ў ТАК “Лосвидо” бібліятэкар **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** запрасіла ў **падарожжа ў заказнік “Роднік желаний”.** Усе разам наведалі заказнік прыроды “Дубрава**”.** Бібліятэкар расказала падарожнікам гісторыі аб мясцовых славутасцях і легендах возера Лосвіда.

**26 лютага ў Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Малахитовая шкатулка” адбылася творчая майстэрня “Волшебные узоры”. На працягу мерапрыемства дзеці выраблялі брошку з пацерак у выглядзе зайчыка.



**26 лютага** ўдзельнікі клуба “Истоки”, які існуе пры **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** сабраліся на **ўрок духоўнасці “Возвысим душу до добра”.** Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з праваслаўнымі кнігамі, якія вучаць уменню дарыць цяпло, любоў, клопат і дабрыню.

**24 лютага** для вучняў 5-6 класа ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” у **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** прайшло **інфарм-падарожжа “Учись быть гражданином”.** Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з літаратурай прававой тэматыкі, расказалі аб дзейнасці публічных цэнтраў прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, аб дзіцячым прававым партале. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава “Счастье твоё закон бережёт”.







**24 лютага** адбылася раённая нарада бібліятэчных работнікаў “Итоги, проблемы и перспективы развития Городокской сети публичных библиотек в 2023 году”. Адміністрацыя, загадчыкі аддзелаў і супрацоўнікі сельскіх бібліятэк сабраліся ў ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”.

Аб выніках работы бібліятэк за 2022 год выступіла дырэктар Абрамава А.В. Пытанні адзінага дня інфармавання асвяціла Адаменка І.В. намеснік дырэктара. Падвяла вынікі работы прафсаюзнай арганізацыі Сіманава А.Л. старшыня прафсаюзнага камітэта. Пытанні датычна падпіскі на 2023 год і сацыяльна-значнай літаратуры агучыла Ратохля І.А. загадчык аддзела камплектавання і апрацоўкі бібліятэчнага фонду. З аналізам статыстычных паказчыкаў за 2022 год і планам работы на 2023 год пазнаёміла Зайцава Л.М. загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу. Потым падвялі вынікі раённых конкурсаў, якія прайшлі ў 2022 годзе, уручылі дыпломы і падарункі. На нарадзе была прадстаўлена выстава выдавецкай дзейнасці аддзела бібліятэчнага маркетынгу.







